Спорт-тайм

# Без медалёў, але з алімпійскімі ліцэнзіямі

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра найбольш актуальныя падзеі выхадных.**



**1.** ***Дзве сярэбраныя ўзнагароды заваявалі беларускія майстры скачкоў на батуце на этапе Кубка свету ў Хабараўску.*** У індывідуальных скачках вызначыўся Уладзіслаў Ганчароў — абагнаць нашага алімпійскага чэмпіёна змог толькі кітаец Гаа Лей. Яшчэ адно «серабро» падапечныя Вольгі Уласавай выйгралі ў сінхронных скачках у мужчын. Дуэт Уладзіслава Ганчарова і Алега Рабцава прайграў толькі амерыканцам Джэфры Глюкштэйну і Аляксею Шостаку.

**2.** ***Беларускія спартсмены Мікіта Свірыд і Даніэль Мукеце выйгралі бронзавыя медалі на турніры серыі Гран-пры Міжнароднай федэрацыі дзюдо ў Ташкенце.*** Абодва беларусы выступалі ў вагавай катэгорыі 100 кг і не ведалі паражэнняў да паўфіналу. На гэтай стадыі Мікіта Свірыд прайграў расіяніну Казбеку Занкішэеву, а Даніэль Мукеце — Зеліму Кацоеву з Азербайджана.

Астатнія беларускія спартсмены, якія выступалі ў сталіцы Узбекістана, у тым ліку і чэмпіёнка Еўропы — 2019 Марына Слуцкая, засталіся без узнагарод.

**3.** ***Беларускія гімнасткі не атрымалі ўзнагарод чэмпіянату свету ў Баку, але заваявалі алімпійскія ліцэнзіі па выніках мнагаборства ў групавых практыкаваннях.*** Пропуск на Алімпіяду ў Токіа быў гарантаваны пяці найлепшым камандам па выніках мнагаборства ў групавых практыкаваннях. Пры гэтым не ўлічваліся вынікі расійскай, балгарскай і італьянскай зборных, у якіх ліцэнзіі на Гульні-2020 ужо былі. Раней алімпійскія ліцэнзіі заваявалі Кацярына Галкіна і Анастасія Салас.



**4.** ***Хакеісты мінскага «Дынама» абыгралі фінскі «Ёкерыт» у дамашнім матчы Кантынентальнай хакейнай лігі з буйным лікам — 5:0.*** Лік на 27-й хвіліне адкрыў абаронца «зуброў» Кірыл Гатавец, падтрымаў пачынанні партнёра па камандзе Тээму Пулкінен (ён аформіў дубль), таксама забітymі галамі адзначыліся Андрэй Касцыцын і Мікіта Феакціставу. Сёння «зубры» згуляюць у гасцях з «Тарпеда» (Ніжні Ноўгарад).

**5.** ***Гандбалісты мінскага СКА перамаглі ў стартавым матчы новага сезона Балтыйскай лігі.*** У першым дамашнім матчы армейцы ўпэўнена перайгралі літоўскі «Драгунас» з Клайпеды з лікам 30:23.

Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова тым часам пацярпеў другое паражэнне запар на групавым этапе Лігі чэмпіёнаў. У суботу «мяшкоўцы» сустракаліся з французскім «Манпелье» і прайгралі ім з лікам 25:27. Нагадаем, у першым туры спаборніцтваў у папярэдняй групе БГК саступіў партугальскаму «Порту». Наступны паядынак у Лізе чэмпіёнаў брастаўчане правядуць 25 верасня ў гасцях у нямецкага «Кіля».

**6.** ***Адбыліся матчы 22-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** Мінскае «Дынама» перайграла «Гомель» — 1:0, «Шахцёр» (Салігорск) быў мацнейшым за «Віцебск» — 4:0, «Нёман» (Гродна) узяў верх над «Дняпром» (Магілёў) — 1:0, « Гарадзея» ўступіла «Дынама» (Брэст) — 1:3, «Мінск» абыграў «Славію» (Мазыр) — 1:0, «Слуцк» саступіў «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна) — 1:2, матч «Энергетыка-БГУ» (Мінск) і «Іслачы» (Мінскі раён) завяршыўся з лікам 1:2. Становішча ў групе лідараў: «Дынама» (Брэст) — 54 ачкі (21 матч), БАТЭ — 49 (20), «Шахцёр» — 49 (20), «Дынама» (Мінск) — 43 (21), «Тарпеда-БелАЗ» — 38 (22), «Іслач» — 37 (22).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.58 | 19.04 | 12.06 |
| Віцебск — | 6.47 | 18.54 | 12.07 |
| Магілёў — | 6.48 | 18.54 | 12.06 |
| Гомель — | 6.45 | 18.51 | 12.06 |
| Гродна — | 7.13 | 19.20 | 12.07 |
| Брэст — | 7.14 | 19.20 | 12.06 |

## Месяц

*Апошняя квадра 22 верасня.*

*Месяц у сузор'і Льва.*

## Імяніны

**Пр.** *Фядоты, Віктара, Германа, Дзмітрыя, Мікалая, Сяргея.*

**К.** *Марыны, Яніны, Герарда, Германа, Тодара.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**24 ВЕРАСНЯ**

**У краіне**

**1893** год — нарадзілася (вёска Будслаў, цяпер у Мядзельскім раёне) Паўліна Вікенцьеўна Мядзёлка, беларуская дзяячка культуры, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Зрабіла значны ўнёсак у развіццё беларускага тэатральнага мастацтва. Удзельніца Віленскага музычна-драматычнага гуртка і Першага беларускага таварыства драмы і камедыі. Адна з першых выканала ролю Паўлінкі ў аднайменнай п'есе Я. Купалы. Арганізавала харавы і драматычныя гурткі ў Гродне, у дзвінскай беларускай гімназіі, Будславе. Пісала вершы, паэмы, песні, п'есы. Памерла ў 1974 годзе.

**1932** год — у Мінску на базе газетнага аддзялення Камуністычнага ўніверсітэта Беларусі імя У. І. Леніна быў заснаваны Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава. Рыхтаваў кадры для раённых, абласных і рэспубліканскіх газет. Прымаліся асобы са стажам работы не менш за тры гады і з двухгадовым стажам кіруючай партыйнай і грамадскай работы. Тэрмін навучання складаў тры гады. Пры КІЖы працавалі аднагадовая вячэрняя школа журналістаў камсамольска-маладзёжных газет і сектар завочнага навучання газетных кадраў. У 1940 годзе рэарганізаваны ў Беларускі інстытут журналістыкі.

**1955** год — Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР зацвердзіў тэкст і музыку Дзяржаўнага гімна Беларускай ССР (тэкст М. Клімковіча, музыка Н. Сакалоўскага).

**У свеце**

**622** год — як мяркуецца, у гэты дзень прарок Мухамед скончыў хіджру — падарожжа з Мекі ў Медыну. У далейшым год хіджры стаў першым годам мусульманскага летавылічэння, і з гэтага моманту фактычна пачынаецца гісторыя ісламу.

**1739** год — нарадзіўся Рыгор Аляксандравіч Пацёмкін, расійскі дзяржаўны і ваенны дзеяч, граф, генерал-фельдмаршал. Удзельнік палацавага перавароту, у выніку якога расійскі трон заняла Кацярына ІІ. У 1783 годзе далучыў да Расіі Крым. Адзін з найбуйнейшых памешчыкаў Расіі. У Беларусі валодаў мястэчкам Дуброўна, а таксама Крычаўскай воласцю, дзе былі заснаваны Крычаўская суднаверф і Крычаўскія мануфактуры. Памёр у 1791 годзе.

**1870** год — нарадзіўся Жорж Клод, французскі інжынер, хімік, вынаходнік неонавай лямпы (1910). Гэтае яго вынаходніцтва стала выкарыстоўвацца для асвятлення і стварэння светлавой рэкламы. Памер у 1960 годзе.

**1938** год — савецкія лётчыцы В. С. Грызадубава, П. Д. Асіпенка і М. М. Раскова на самалёце АНТ-37 «Радзіма» пачалі беспасадачны пералёт па маршруце Масква — Далёкі Усход. За 24 гадзіны 29 хвілін была пераадолена адлегласць у 6450 кіламетраў і ўстаноўлены жаночы міжнародны рэкорд далёкасці. 2 лістапада яны сталі першымі жанчынамі ў СССР, удастоенымі ганаровага звання Героя Савецкага Саюза.



**1989** год — Папа Рымскі Ян Павел ІІ афіцыйна ад імя каталіцкай царквы абвясціў: Галілей меў рацыю, сцвярджаючы, што Зямля верціцца вакол Сонца.

# УСМІХНЕМСЯ

**Чым больш выпіў у панядзелак, тым бліжэйшая пятніца.**

— Прывітанне, ты што, пакрыўдзілася?

— Не, але мне будзе прыемна, калі ты папросіш прабачэння.

**Сёння ў краме дзіцячых цацак бачыў дзеда з унукам.**

**Дзед прасіў прадаўца падабраць як мага больш барабан, бо, кажа, яму ўнука на выхадныя здалі з дудкай — хоча вярнуць дзіця бацькам з барабанам.**

Жонка ў новай сукенцы круціцца перад мужам:

— Ну як я табе?

Муж *(адрываючыся ад газеты)*:

— Трохі надакучыла, а так нічога.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3134.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 верасня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12